# “Бібліяноч” кіпіць — чытач не спіць

**Гульні, майстар-класы, творчыя сустрэчы. Учора, роўна ў 19.00, бібліятэкі Беларусі распачалі “Бібліяноч-2023”. Чым кніжныя скарбніцы пацешылі наведвальнікаў?**

▪ **Нацыянальная бібліятэка Беларусі** прапанавала гасцям “БібліяІмпульс”. У праграме былі квэсты, літаратурны салон, настольныя гульні, этнавечарына і нават чайны рытуал “Тры кубкі тэксту”. З аншлагам прайшлі лекцыі адваката, астрапсіхолага, нутрыцыёлага, імідж-стыліста. Прыхільнікаў зацікавілі і майстар-класы па фантастычнай ілюстрацыі, бальных танцах. Дзятву парадавалі выступленні юных артыстаў.

▪ **Рэспубліканская навуковая медыцынская бібліятэка** запрасіла на “Начны абанемент”, дазволіўшы чытачам зазірнуць за кулісы распрацоўкі электроннай медыцынскай бібліятэкі, здзейсніць падарожжа па фондзе рэдкай кнігі, даведацца пра сакрэты вечнай маладосці, уласнаручна вырабіць абярэг, паспаборнічаць у інтэлектуальнай бітве “Выбух мозга” і прадэгуставаць напоі ў начным фітабары. Тым часам на дзіцячай пляцоўцы Нулік і Сімка вучылі малых скетчынгу і дапамагалі ствараць пацешныя налепкі.

▪ **Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі** зладзіла мерапрыемства “Тэрыторыя навукі”, дзе можна было адправіцца ў далёкае мінулае, убачыць экспанаты археолага-антрапалагічнай выставы, адчуць сябе даследчыкам і дакрануцца да таямніц хімічных з’яў.

▪ **Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка імя І. С. Лупіновіча** арганізавала “Аграсядзібу”, падараваўшы наведвальнікам магчымасць параіцца з пчалярамі, пакаштаваць гаючую гарбату, дазнацца шмат нова пра экалогію і здароўе, а пры жаданні — захапіць кніжку з “Літаратурнага чамаданчыка”.

▪ **Цэнтральная дзіцячая бібліятэка імя М. Астроўскага** запрасіла юных жыхароў сталіцы на “Бібліяпрыцемкі”. Хлопчыкаў і дзяўчынак чакалі кніжная фея, тэатралізаваныя чытанні, літаратурныя віктарыны і мора прыемных сюрпрызаў.

▪ **Цэнтральная бібліятэка імя Я. Купалы** падрыхтавала маштабную праграму, прысвечаную беларускім традыцыям. Гасцей таксама пацешылі фотазона з прадметамі народнага побыту, майстар-класы па саломапляценні і вырабе беларускай лялькі-абярэга. Для маленькіх працавалі інтэрактыўная пляцоўка, “Пальчыкавы тэатр”, прайшоў вячэрні кінасеанс.

▪ Захапіла “Бібліяноч” і рэгіёны. Так, **навуковая бібліятэка Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы** правяла “Бібліятэчны квэст па лабірынтах Залюстроўя”. Ахвотныя змаглі прымераць вобразы герояў Льюіса Кэрала, наведаўшы студыю аквагрыму ЧэшырскагаКата, разгадаць загадкі ад Капялюшніка. Сіні Вусень раздаваў парады, Белы Трусік прапаноўваў забавы. А на балі ў Чырвонай Каралевы адбыўся бяспройгрышны аўкцыён падарункаў ад Алісы.

▪ Сетка бібліятэк **Кіраўскага раёна** прываблівала чытачоў экскурсіяй “Кніжны дом, або Бібліятэка без меж”, **Слаўгарадскага** — “Магіяй кнігі”, Хоцімскага — прапановай “Сустрэнемся ў гэтую «Бібліяноч»!”.

▪ **Шклоўская цэнтральная бібліятэка** з нагоды 100-гадовага юбілею запрасіла сваіх прыхільнікаў у літаратурную гасцёўню “Бібліятэка збірае сяброў”.

Дарэчы, да маштабнай акцыі мог далучыцца кожны ахвотнік: уваход для аматараў чытання быў вольны.